Структурна-семантычныя мадыфікацыі ў беларускай і англійскай мовах

ДАЛУЧЭННЕ, СЕГМЕНТАЦЫЯ, РЭДУКЦЫЯ, СТРУКТУРНЫЯ І СЕМАНТЫЧНЫЯ МАДЭЛІ, ПАРЦЭЛЯЦЫЯ, ІМЕННЫ ТЭМЫ, ІМЕННЫ ПАЯСНЯЛЬНА-ТЛУМАЧАЛЬНЫ, ДЫФЕРЭНЦЫЯЦЫЯ ЗНАЧЭННЯ, ПАРАДЫГМА СТРУКТУРНА-СІНТАКСІЧНЫХ МАДЫФІКАЦЫЙ

Структурна-семантычныя мадыфікацыі ў беларускай і англійскай мовах [Тэкст]: Справаздача аб НДР (заключ.): / БДПУ; кіраўн. Субота К.І. - Мн., 2020. - 87 с., 8 мал., 1 дадатак - Бібліягр.: С. 80-85 (50 назв.). - № ДР 20200586.

**Аб’ект:** беларускія і англійскія далучальныя, сегментаваныя і рэдукаваныя канструкцыі як адзінкі сінтаксічных сістэм рознай тыпалогіі.
**Мэта:** пабудаваць сінтаксічную тыпалогію далучальных, сегментаваных і рэдукаваных канструкцый у беларускай і англійскай мовах.
**Метады:** тыпалагічна-супастаўляльны, дыстрыбутыўны, кампанентны аналіз, сінтаксічнае мадэляванне, колькасныя падлікі, нелінейныя метады (табліцы, схемы, дыяграмы).
**Вынік**. У даследаванні ўпершыню метадалагічныя прынцыпы супастаўляльна-тыпалагічнага мовазнаўства верыфікаваны для аналізу далучальных, сегментаваных і рэдукаваных канструкцый у беларускай і англійскай мовах; вызначана іх тыпалагічнае падабенства і адрозненне з улікам універсальных і спецыфічных катэгорый моў з сінтэтычным і аналітычным ладам граматычных сістэм; распрацавана канцэпцыя сінхроннага тыпалагічнага даследавання з’яў далучэння, сегментацыі і рэдукцыі ў беларускай і англійскай мовах. Упершыню распрацавана структурна-семантычная тыпалогія далучальных, сегментаваных і рэдукаваных канструкцый у беларускай і англійскай мовах, вылучаны асноўныя іх тыпы і відавыя класы з улікам узроўню сінтаксічнай арганізацыі, пазіцыі адносна базавай часткі, ступені аддаленасці ад яе; наяўнасці або адсутнасці сэнсавага карэлята, магчымасці фармалізацыі аб’екта сінтаксісу ў структурна-семантычныя мадэлі; сэнсавай дастатковасці.
**Ступень укаранення.** Вучэбны працэс БДПУ.
**Вобласць выкарыстання**: мовазнаўства, методыка выкладання беларускай і англійскай моў, літаратуразнаўства.